1. *Амяльковіч, Д.* «Падвойнае дно» Пане Каханку / Д. Амяльковіч // Культура. – 2010. – № 13. – С. 2, 11.

2. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. И. Барышев. – Минск: Наука и техника, 1992. – 293 с.

3. *Дадиомова, О. В.* Музыкальная культура городов Белоруссии XVIII века / О. В. Дадиомова. – Минск: Наука и техника, 1992. – 205 с.

4. *Костюковец, Л. Ф.* Кантовая культура в Белоруссии / Л. Ф. Костюковец. – Минск: Вышэйшая школа, 1975. – 96 с.

5. *Минчукова, Е.* Сергей Ковальчик: «Человеку нужен полёт» / Е. Минчукова // Директор. – 2010. – № 4. – С. 72–74.

*Д. С. Рубан, аспірант*
*БДУ культуры і мастацтваў.*
*Навуковы кіраўнік – Л. І. Доўнар,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНАЯ КНІГА ДЛЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (1991–1996)

У сучасных умовах развіццё грамадства ведаў, развіццё дзяржавы, рэформы ў адукацыі, змена яе парадыгм, увядзенне новых вучэбных дысцыплін, укараненне сучасных тэхналогій – усё гэта патрабуе абнаўлення забеспячэння вышэйшай адукацыі вучэбнай кнігай, распрацоўкі тэарэтычных асноў яе развіцця. На сённяшні дзень вучэбная кніга цалкам, у тым ліку і для вышэйшай школы, у працэсе адукацыі з’яўляецца адной з важнейшых крыніц інфармацыі, сродкам навучання, ад якасці і зместу якой залежыць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў. Развіццё вучэбнай кнігі для вышэйшай школы, з аднаго боку залежыць ад мэтаў і задач, якія ставяцца перад вышэйшай школай, з другога – ад агульных заканамернасцей развіцця выдавецкай сістэмы Беларусі.

На сучасным этапе распрацоўваюцца тэарэтычныя асновы вучэбнай кнігі для вышэйшай школы (С. Г. Антонава, П. Г. Буга, К. І. Былінскі, А. А. Грачыхін, О. У. Даўжэнка, В. І. Данецкая, Б. М. Кедроў, І. П. Касценка, Н. Н. Арлова, М. І. Тупальскі, Л. Г. Цюрына, Е. І. Цыганкова).

Аналіз навуковай літаратуры, матэрыялаў дысертацыйных даследаванняў, артыкулаў з перыядычнага друку, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў дае падставу зрабіць вынік,

што на сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларуь пытанні тэорыі вучэбнай кнігі для вышэйшай школы асветлены недастатко-ва. Сустракаюцца работы па праблемах падрыхтоўкі асобных відаў вучэбнай кнігі (Н. І. Тупальскі). Адзінкавыя звесткі па дадзенай праблеме, матэрыялы прыкладнога характару змешчаны ў навуковых працах па кнігазнаўстве, тыпалогіі кнігі, кніжнай справе цалкам.

У дадзеным артыкуле мы спрабуем вызначыць асноўныя кірункі вучэбнага кнігавыдання для вышэйшай школы на беларускай мове, на аснове бібліяметрычнага аналіза вылучыць прыярытэты ў тэматыка-тыпалагічным складзе выданняў па галінах ведаў і відах вучэбнай кнігі за перыяд з 1991 па 1996 гг.

1991–1996 гг. – першы этап новага беларускага кнігавыдання, які можна ахарактарызаваць як этап дэманапалізацыі дзяржаўнага кнігавыдання, яго раздзяржаўлення, арганізацыі дзейнасці выдавецтваў прыватнага характару і структурных зменаў у выдавецкай сферы. Узнікненне недзяржаўных выдавецтваў, а таксама атрыманне права на выдавецкую дзейнасць шэрагам устаноў (навуковых, вучэбных) і грамадскіх арганізацый паспрыяла абнаўленню і ажыўленню кніжнай справы Беларусі. Гэта быў этап актыўнага перавыдання нацыянальнай кніжнай спадчыны – з аднаго боку, а з другога – задавальнення патрэб кніжнага рынку, дзе дзейнічала кан’юктура масавага чытацкага попыту. Таму ў гэты перыяд у Беларусі адбываецца рост кніжнай прадукцыі. [2, с. 189, 190].

Адносна вучэбнага кнігавыдання для вышэйшай школы на беларускай мове, таксама назіраецца павелічэнне колькасці найменняў і тыражу. Так, у 1991 г. вучэбная кніга для вышэйшай школы на беларускай мове складала 37 назваў, а ў 1996 г. – 113, г. зн. колькасць найменняў з 1991 г. па 1996 г. павялічылася амаль у тры разы. Што датычыцца тыража, то ў 1991 г. ён складаў 27 355 экз., а ў 1996 – 146 335 экз. Неабходна адзначыць, што значная частка высокіх паказчыкаў па тыражу была дасягнута дзякуючы выдавецкай дзейнасці недзяржаўных выдавецтваў, такіх як Экаперспектыва, Беларускі фонд Сораса, Эканамічныя тэхналогіі.

Асноўная частка вучэбнай кнігі прыходзіцца на выдавецтвы вышэйшых навучальных устаноў (больш 90%). У гэты перыяд амаль ва ўсіх ВНУ Беларусі з’явіліся розныя рэдакцыйна-выдавецкія падраздзяленні. Аднак рэдакцыйна-выда-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вецкія цэнтры вышэйшых навучальных устаноў не могуць паспяхова канкурыраваць з буйнымі выдавецтвамі. Нізкая рэнтабельнасць вузаўскіх выданняў не дазваляе істотна палепшыць паліграфічнае выкананне і значна павялічыць тыражы гатовай друкаванай прадукцыі.

Што тычыцца дзяржаўных выдавецтваў, то 1991–1996 гг. – быў даволі складаны час у іх дзейнасці. Штогод адзначаўся спад практычна ўсіх асноўных паказчыкаў. Некаторая фінансавая падтрымка кнігавыдання з дзяржбюджэту гарантавала адносную стабільнасць дзяржаўным выдавецтвам. Менавіта дзякуючы дзяржзаказам на вучэбную і вучэбна-метадычную літаратуру для ўсіх форм адукацыі ім ўдавалася выжываць ва ўмовах цяжкага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны [2, с. 191]. На вядучых пазіцыях у сектары дзяржаўнага вучэбнага кнігавыдання для вышэйшай школы былі такія выдавецтвы, як «Універсітэцкае», «Беларусь», «Вышэйшая школа».

Цалкам рэпертуар вучэбнай кнігі для вышэйшай школы на беларускай мове ў 1991–1996 гг. меў наступныя галіновыя прыярытэты:

- вучэбная кніга па філалогіі (мовазнаўства);
- вучэбная кніга па педагогіцы, адукацыі і выхаванні;
- вучэбная кніга па гістарычных і эканамічных навуках.

Вядучыя пазіцыі па відах выданняў (па характары інфармацыі) займалі:

- метадычныя дапаможнікі;
- практыкумы;
- вучэбныя дапаможнікі;
- тэксты лекцый;
- падручнікі.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што вучэбнае кнігавыданне, як і ўся выдавецкая сфера краіны ўжо на першым этапе зведала значнае рэфармаванне. Беларусь стала першай сярод былых Рэспублік СССР (апярэдзіўшы Расію і Украіну), дзе была створана рынкавая сістэма ў кнігавыданні і сфарміраваліся два ўмоўна самастойныя патокі выдавецкай прадукцыі – кнігі дзяржаўных і недзяржаўных выдавецтваў [1].

Аднак, нягледзячы на вышэйазначаныя станоўчыя тэндэнцыі вучэбнага кнігавыдання на беларускай мове, прходзіцца канстатаваць, што вучэбная кніга для вышэйшай школы на беларускай мове складала невялікі працэнт адносна вучэбнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кнігі на рускай мове. Напрыклад, у 1991 г. – 10 %, а у 1993 – 16 %. Таксама неабходна падркрэсліць, што практычна адсутнічаюць выданні на беларускай мове па такіх галінах, як тэхніка, матэматыка, хімія, фізіка, медыцына. Такі від выдання як падручнік знаходзіцца на апошнім месцы сярод метадычных дапаможнікаў, практыкумаў, вучэбных дапаможнікаў, лекцый і інш.


1. *Ананіч, Л.* Сучасны стан беларускага кнігавыдання / Л. Ананіч // 480 год беларускага кнігавыдання: матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў / А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел. навука, 1998. – С. 257–259. – (Беларусіка = Albaruthenica; кн. 9).

2. *Доўнар, Л. І.* Кнігавыдавецкая дзейнасць Мінска ў кантэксце сучасных тэндэнцый развіцця кніжнай справы Беларусі / Л. І. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. арт. / склад. Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк, Т. А. Дзем'яновіч. – Мінск, 2008. – Вып. 2. – С. 188–210.



*И. А. Столярова, аспирант*
*БГУ культуры и искусств.*
*Научный руководитель – Н. В. Клименкова, кандидат педагогических наук, доцент*


## ТЕОРЕТИКО-МЕТОДИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ БИБЛИОТЕРАПИИ ДЛЯ ДЕТСКОЙ АУДИТОРИИ

Понятие «библиотерапия» (от греческого biblio – книга и therapeia – лечить) было введено в научный оборот в США в начале XX века. S.Mc.Crothers впервые в истории библиотерапевтической мысли осуществляет теоретическую дифференциацию библиотерапии, определяя ее как *предписание книг в медицине и психиатрии для терапевтической помощи пациентам* [13, с. 1044]. Существует порядка 40 определений термина «библиотерапия» и их количество продолжает возрастать. Авторы рассматривают данное понятие в различных плоскостях: как предписание материала для чтения, которое помогает развивать ум, питать психическое здоровье (Дж. Пардек) [13], как научную дисциплину, изучающую закономерности смыслового восприятия письменной речи (В. С. Крейденко) [7], как одно из направлений педагогики чтения

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ